# Спрэчкі па дакладу тав. Г. П. Катлярова „Аб дзяржаўным бюджэце БССР на 1944 год“

## Прамова сакратара ЦК КП(б)Б па кадрах, дэпутата Н. Е. Аўхімовіча

Таварышы дэпутаты! Бюджэт нашай рэспублікі на 1944 год унесены ўрадам на разгляд і зацверджанне сесіі, з'яўляецца дакументам вялікай гістарычнай важнасці.

Подлыя крывавыя гітлераўцы якія вераломна напалі на нашу краіну, навязалі нам цяжкую вайну. Беларусь першая прыняла на сябе ўдар азвярэлых гітлераўскіх банд. Беларускія гарады, калгасы запылалі заравам пажараў.

Вораг абрабаваў, разбурыў наш край. У нас была магутная сучасная прамысловасць, у нас раслі і мацнелі высокія ўраджаі на калгасных палях. Народ ганарыўся сваімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, сельскагаспадарчым універсітэтам у Горках, стагоддзе якога адзначаў увесь савецкі народ незадоўга да вайны. Мы ганарыліся нашым Беларускім дзяржаўным універсітэтам, які рыхтаваў высокакваліфікаваных работнікаў навукі, прамысловасці і сельскай гаспадаркі. 36 вышэйшых навучальных устаноў нашай рэспублікі штогод рыхтавалі краіне 16 тысяч чалавек высокакваліфікаваных спецыялістаў. У нашых школах, якіх налічвалася звыш 13.000, навучалася больш за два з паловай мільёны моладзі і дзяцей. Акадэмія Навук з яе інстытутамі і добра абсталяванымі лабараторыямі з'яўлялася цэнтрам навуковай думкі.

У 1941 годзе ў Беларусі было 23 тэатры, звыш 1.000 кінотэатраў і больш за 500 кіноперасовак. Нашы прыгожыя гарады Мінск, Гомель, Віцебск, Магілёў, Брэст, Баранавічы, Ліда, Беласток былі красой і гордасцю беларусаў.

З першых дзён вялікай Айчыннай вайны наш народ, пад кіраўніцтвам вялікай партыі большэвікоў, як адзін чалавек, узняўся на абарону сваёй Радзімы, сваёй чэсці, свайго жыцця. Ужо ў чэрвені 1941 года ляцелі пад адкос варожыя эшалоны на магістралі Аўгустоў—Гродна. Ужо 27 чэрвеня, узяўшы зброю, пайшлі ў лес насустрач ворагу слаўныя атрады партызан, першых Герояў Савецкага Саюза Бумажкова і Паўлоўскага.

Ужо ў першых лічбах ліпеня 1941 года, пасля гістарычнай прамовы 3 ліпеня нашага правадыра таварыша Сталіна, тысячы камуністаў і камсамольцаў, атрымаўшы ўказанні і даручэнне ЦК КП(б)Б і асабіста таварыша Панамарэнка, засталіся і накіраваліся ў тыл ворага, насустрач ворагу для арганізацыі магутнага партызанскага руху, дзеля таго, каб падняць народ на ўсенародную партызанскую вайну. З ліку гэтых людзей сёння прысутнічаюць на нашай сесіі дэпутаты і сакратары абласных і гарадскіх камітэтаў партыі—кіраўнікі савецкіх устаноў тт. Куцак, Кожар, Барыкін, Казлоў, Каралёў, Маркаў—яны сёння генералы і Героі Савецкага Саюза.

Вялікія гістарычныя перамогі, атрыманыя ў 1942—1943 гадах нашай Чырвонай Арміяй, нясуць вызваленне народу Беларусі ад нямецкай акупацыі. Ужо да паўсотні раёнаў вызвалены і вярнуліся да вольнага жыцця, да аднаўленай працы.



Вайна яшчэ не скончана. Вораг яшчэ топча сваім брудным ботам і мучыць народ $^3/_4$ нашай рэспублікі. Але ўжо ясна для ўсіх, што блізка час, калі пад ударамі Чырвонай Арміі і партызан сканае вораг, і наша Радзіма будзе поўнасцю вызвалена ад гітлераўскіх прышэльцаў.

Наш народ у годы мірнага будаўніцтва і ў годы Айчыннай вайны кожны дзень адчувае бацькоўскія клопаты таварыша Сталіна. Таварыш Сталін сказаў, што адной з галоўных задач з'яўляецца ўжо ў ходзе вайны, як мага хутчэй аднавіць разбураную немцамі гаспадарку, вярнуць народу вызваленых абласцей і раёнаў чалавечыя ўмовы жыцця.

---

(Прамовы друкуюцца па скарочанай стэнаграме).

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

***З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі***